

# Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча



## Да 60-годдзя з дня стварэння



Творчыя калектывы, якія з самага пачатку дзейнасці ўзялі за правіла не ісці ў мастацтва пратаптанымі сцежкамі, каб не паўтараць і не капіраваць сваіх папярэднікаў, заўсёды імкнуцца быць першаадкрывальнікамі, эксперыментатарамі. Да іх належыць і Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча. Шэсць дзесяцігоддзяў гэты славуты калектыў дорыць слухачам свята песні, танца, музыкі, свята сустрэчы з беларускім народным мастацтвам. З жывапіснай песеннай вёскі Вялікае Падлессе, што знаходзіцца ў Ляхавіцкім раёне Брэсцкай вобласці, забіла жыватворная крыніца яго звонкага, чыстага шматгалосся. 29 лютага 1952 года на аснове невялікага Падлесскага хору, які сфарміраваў і ўзначаліў Г. І. Цітовіч, харавы дырыжор, фалькларыст, этнограф, вялікі знаўца народнай музыкі, і быў створаны гэты славуты песенны калектыў.



З першых выступленняў хор набыў папулярнасць і стаў захавальнікам народнай песні і музыкі, своеасаблівым носьбітам нацыянальнай культуры. Музычная грамадскасць, беларускія кампазітары, крытыкі аднадушна прызналі яго высокамастацкую выканаўчую манеру. Больш за 20 гадоў хорам кіраваў Г. І. Цітовіч. Выкарыстоўваючы ўласны вопыт ранейшай працы з аматарамі сцэны, Генадзь Іванавіч адразу выбраў правільны шлях творчага развіцця калектыву, дакладна вызначыў яго рэпертуарную лінію, накіраваную перш за ўсё на выкананне лепшых узораў нацыянальнага фальклору і песень беларускіх кампазітараў.





*Працяг на с. 3 вокладкі.*

*Працяг. Пачатак на с. 2 вокладкі.*

«Рэчанька», «Купалінка», «Ой, рана на Йвана», «Лясная песня», «Ой, хацела ж мяне маці замуж аддаці» і яшчэ шмат іншых песенных твораў, задушэўных, лірычных, прасякнутых глыбокімі патрыятычнымі пачуццямі, жанрава-бытавых, з жывым гумарам і дасціпным жартам, упершыню прагучалі на прафесійнай сцэне ў выкананні артыстаў хору.

У станаўленні танцавальнай групы калектыву актыўны ўдзел прыняў народны артыст СССР І. А. Маісееў. Ён паставіў танец «Юрачка» і вакальна-харэаграфічную карцінку «Як той Зосі давялося». Уменнем ствараць новыя танцы, беражліва захоўваючы іх народную аснову, вызначаліся пастаноўкі балетмайстра, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі В. В. Варановіча. Яго «Мяцеліца», «Полька з прысюдамі», «Таўкачы», «Вялікі купальскі карагод» і іншыя служаць узорам творчага стаўлення да фальклору. Яны доўгія гады разам з беларускімі народнымі танцамі «Крыжачок», «Лядкаўская кадрыля», песней і танцам «Бульба» ўпрыгожвалі канцэртную праграму хору.

З 1975 года мастацкім кіраўніком і галоўным дырыжорам народнага хору з'яўляецца М. П. Дрынеўскі, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1978), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1982), народны артыст БССР (1987), прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі (1992). Менавіта пад яго кіраўніцтвам калектыў дасягнуў мастацкіх вышынь выканальніцкага майстэрства і атрымаў ганаровыя пачэсныя званні «нацыянальны» і «акадэмічны». Кожнае выступленне хору — гэта спектакль, арганічнае зліццё песні, танца, музыкі і фальклору. Песня суправаджаецца рухам, танец быццам нараджаецца з песні, а абрады — сапраўды тэатралізаваныя, закончаныя дзеянні. Асаблівай інтанацыйнай тонкасцю вылучаюцца падрыхтаваныя М. П. Дрынеўскім канцэртныя праграмы з твораў духоўнай музыкі, некаторыя з іх сталі літургіямі ў саборах Еўропы і ўзорам пранікнёнасці і прафесіяналізму, прагучаўшы на фестывалі «Магутны Божа».

Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча шмат гастралюе. Яго выступленні з захапленнем прымалі ў Маскве, Санкт-Пецярбургу, гарадах Цэнтральнай Расіі, у Паволжы і Сібіры, на Каўказе і Украіне, у Прыбалтыцы. На карце гастролей ёсць маршруты і далёкага замежжа: Кітай, Францыя, Фінляндыя, Карэя, Турцыя, Канада і іншыя краіны свету. Хочацца пажадаць калектыву далейшых сапраўдных творчых адкрыццяў, удзячных слухачоў і гледачоў, вялікіх поспехаў у справе папулярызацыі беларускай народнай музыкі ў нашай краіне і за яе межамі.

*К. Д. Варанько, вядучы бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*







